# ЮБІЛЕІ. ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## ПЕРШЫ ВЫКЛАДЧЫК ГЕАГРАФІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ГІСТОРЫІ МДУ ІМЯ А. КУЛЯШОВА – МІХАІЛ РУДНЕЎ

**А.Р. Агееў, МДУ імя А.Куляшова, г. Магілёў, Беларусь**

У сувязі з вострым недахопам кваліфікаваных настаўнікаў ў беларускіх губернях у пач. XX ст. пачынаюць утварацца настаўніцкія інстытуты. Ва ўмовах хуткага пашырэння сеткі пачатковых школ і слабаразвітай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў жыццё выводзіла праблему дэфіцыту падрыхтаваных педагогаў у разрад першачарговых. У выніку ў 1913 г. у Магілёве пачаў дзейнічаць настаўніцкі інстытут, які ў 1918 г. быў пераўтвораны ў педагагічны і ад якога, у сваю чаргу, вядзе свой радавод Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова.

Інстытут стаў першай у губерні спецыяльнай педагагічнай установай з трохгадовым тэрмінам навучання. Геаграфія і гісторыя адразу занялі прыстойнае месца ў вучэбнай праграме гэтай сярэдняй па сваім статусе навучальнай установы. Ужо пры паступленні абітурыенты пісалі тры пісьмовыя работы, здавалі вусныя іспыты па 9 прадметах, у т.л. па гісторыі, геаграфіі і прыродазнаўстве. Паступоўцы ў гарадское пры інстытуце вучылішча здавалі геаграфію, гісторыю і яшчэ 6 іспытаў [6, арк. 11; 7, арк. 2–2Аб].

Абітурыенты павінны былі паказаць дастаткова шырокія геаграфічныя і глыбокія гістарычныя веды. Так, па геаграфіі патрабавалася веданне геаграфічных карт усіх частак свету і Расійскай імперыі; геаграфіі Расійскай імперыі ў межах падручніка Баранава і Гарэлава; асноўных паняццяў фізічнай геаграфіі, геаграфіі чатырох частак свету (Азіі, Афрыкі, Амерыкі і Аўстраліі) і асобна Еўропы ў межах падручніка Іванова «Пачатковы курс геаграфіі» часткі I, II, III [6, арк. 51].

Прэтэндэнты на вучобу ў настаўніцкі інстытут павінны былі паказаць веды: рускай гісторыі ў межах падручніка па прадмету Елпацьеўскага, «або (яшчэ лепей)» прафесара С. Платонава; старажытнай гісторыі, гісторыі сярэднявечча і новай гісторыі ў аб'еме скарочанага падручніка ўсеагульнай гісторыі Іванова. Паступоўцы мусілі ўмець арыентавацца як у гістарычнай карце Расіі, так і ў гістарычных картах старажытнага свету, сярэдніх вякоў і новага часу [6, арк. 51–51].

Дырэктар настаўніцкага інстытута стацкі саветнік У. М. Тычынін энергічна пачаў фарміраваць штат установы і ствараць яе матэрыяльную базу. Ужо ў ліпені было выдаткавана 1000 руб. на закупку прыбораў для выкладання прадметаў. Больш чым на 2000 руб. па рэшце на канец 1913 г. было закуплена абсталявання, рэактываў, прэпаратаў, наглядных дапаможнікаў. Падпіска на 1914 г. рабілася з-за адсутнасці сродкаў у крэдыт праз Магілёўскае таварыства цвярозасці. Самым дарагім з выпісаных інстытутам шасці часопісаў быў «Исторический вестник», які каштаваў 12 руб. А трэцюю частку падпіскі складалі часопісы геаграфічнай накіраванасці «Природа и Люди» (5 руб.) і «Естествознание и География» (3 руб. 50 кап.). [5, с. 16].

Асабовы склад служачых у інстытуце ў 1913 г. налічваў 14 чалавек. Кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі і дырэктар інстытута Тычынін імкнуліся падабраць для новай установы высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Выкладаць гісторыю і геаграфію быў запрошаны калежскі асэсар Міхаіл Рыгоравіч Руднеў. Праваслаўны па веравызнанні, ён скончыў курс па гістарычным аддзяленні гісторыка-філасофскага факультэта Юр'еўскага ўніверсітэта і 16 верасня 1910 г. паступіў на службу. У імянных спісах 1914 і 1916 гг. «наяўнага саставу служачых, якія ў выпадку заслугі маглі атрымаць узнагароду», значыцца і М.Р. Руднеў [1, с. 18]. Гэта бадай уся інфармацыя пра першага гісторыка інстытута, якой мы валодалі да апошняга часу. Але пошукі ў віленскіх архівах прыадкрылі нам заслону над таямніцамі лёсу гэтага чалавека.

У 1912 і 1913 гг. выкладчык гісторыі Пінскай жаночай гімназіі Мінскай губерні Міхаіл Руднеў звяртаўся да Апекуна Віленскай навучальнай акругі з просьбай перавесці яго з Пінску ў які-небудзь іншы горад і іншую сярэднюю мужчынскую або жаночую навучальную ўстанову на пасаду выкладчыка гісторыі. Прычынай просьбы быў сыры клімат горада Пінска, які «шкодна адбіваўся на стане» яго здароўя. Прычым 16 мая 1913 г. у сваім прашэнні ён пісаў, што «шкоднае дзеянне пінскага клімату адбілася на мне настолькі, што па парадзе ўрачоў лета прымушаны праводзіць у Крыме». Баючыся,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што «па кліматычных умовах далейшае знаходжанне ў г. Пінску... будзе зусім немагчымым», Руднеў настойліва прасіў перавесці яго на новае месца працы [4, арк. 2, 4].

Іншай падставай для пераводу ў прашэнні была названа нагрузка гісторыяй толькі ў VIII класе жаночай гімназіі. Апошняя акалічнасць выклікала няўпэўненасць у нагрузцы з-за таго, што колькасць навучэнак, якія паступалі ў восьмы клас, не была кожны год аднолькавай, што «існаванне гістарычнага аддзялення ў VIII класе ў пачатку кожнага навучальнага года можа падвяргацца сумневу, і мае становішча ў якасці выкладчыка Пінскай гімназіі ў пачатку кожнага навучальнага года можа быць няпэўным і непрыемным (як гэта было ў пачатку 1911/12 навучальнага года).» З ліставання выявілася, што прасіла перавода і Марыя Канстанцінаўна Шабуніна-Руднева – жонка Міхаіла Руднева. Яна працавала выкладчыцай гісторыі ў гэтай жа Пінскай жаночай гімназіі [4, арк. 2–2Аб].

Як бачна з дакументаў архіва, пасля звароту былі запрошаны неабходныя для пераводу даведкі. З іх высвятляецца, што Руднеў скончыў «курс па гістарычным аддзяленні гісторыка-філасофскага факультэта сапраўдным студэнтам гісторыі ў 1909 г. у Юр'еўскім універсітэце», меў пасведчанне звання настаўнік гімназіі і прагімназіі, з правам выкладаць гісторыю» [4, арк. л. 3].


Природа и Люди
№ 18
ИЛЛЮСТРИРОВАННЫЙ ЖУРНАЛЪ НАУКИ, ИСКУССТВА и ЛИТЕРАТУРЫ
1915 г.
СЕРДЦЕ ЗЕМЛИ

Выконваючы абавязкі начальніка Пінскай гімназіі выказаў меркаванне, што перавод Руднева на лепшае месца «заслугоўвае ўвагі», і даў яму 12 чэрвеня 1912 г. дастаткова фармальную, але станоўчую характарыстыку: «Руднеў – акуратны і добрасумленна выконваючы свае абавязкі настаўнік. Ён цікавіцца сваім прадметам, папаўняе свае пазнанні чытаннем навуковых даследаванняў. Можна спадзявацца, што з яго выпрацуецца вопытны выкладчык. Як чалавек, ён цвярозага жыцця і са спагадлівай душой» [4, арк. л. 3].

Просьба калежскага асэсара Міхаіла Рыгоравіча Руднева аб пераводзе нарэшце была задаволена, і ў пачатку верасня ён прыбыў у Магілёўскі інстытут для службы настаўнікам гісторыі і геаграфіі. Пераезд у іншае месца заўжды з'яўляецца стрэсам. Цалкам верагодна, што нейкія рэчы: горад, узровень коштаў, жыллёвыя ўмовы ці новы калектыў не надта спадабаліся Рудневу. На гэта наклалася неабходнасць распрацоўкі і выкладання новых прадметаў. Гісторык па адукацыі павінен быў выкладаць не толькі гістарычныя, а таксама і геаграфічныя дысцыпліны. Магчыма, Руднеў недаацаніў усе гэтыя складанасці? Магчыма, ягоныя амбіцыі былі вышэйшыя, і ён разлічваў на працу ў гімназіі? Якімі б



Электронный архив ... имени А.А. Кулешова

ні былі прычыны, але ўжо шостага верасня, фактычна яшчэ не прыступіўшы да выканання сваіх абавязкаў, ён напісаў на імя дырэктара Тычыніна заяву: «Гонар маю заявіць Вам, што не магу прыняць на сябе абавязкі выкладання геаграфіі і методыкі геаграфіі па праграмах настаўніцкага інстытута і таму адмаўляюся ад пасады выкладчыка ў настаўніцкім інстытуце» [4. арк. л. 6]. Было гэта фармальнай прычынай, каб не пераязджаць у Магілёў, ці рэальна выкладанне геаграфічных дысцыплін уяўлялася гісторыку вельмі складанай, а можа, не надта прыемнай задачай, сказаць сёння цяжка.

Тычынін, перад якім стаялі і іншыя тэрміновыя і шматлікія праблемы па адкрыцці інстытута, вымушаны быў у гэты ж дзень дакласці Папячыцелю Віленскай навучальнай акругі: «...нягледзячы на ўсе пераконванні, выкладчык гісторыі і геаграфіі даверанага мне інстытута п. Руднеў падаў мне заяву, якая прыкладаецца пры гэтым, што ён адмаўляецца ад пасады выкладчыка ў інстытуце». На дакладную з канцылярыі Папячыцеля 11 верасня прыйшоў адказ «для абвяшчэння выкладчыку Рудневу, што на службу ў Пінскую гімназію ён не будзе вернуты». Адначасова Папячыцель даручыў Тычыніну запытацца, ці трэба «лічыць яго заяву аб адмове службы ў інстытуце як прашэнне аб звальненні?» Такой рэзкай рэакцыі на адмову чытаць геаграфію Руднеў, відаць, не чакаў і пасля азнаямлення з лістом Папячыцеля прасіў не лічыць яго заяву прашэннем аб звальненні [ЛДГА. – спр. 410, л. 5–8].

У такім умовах Руднеў з восені 1913 г. пачаў выкладаць гісторыю і геаграфію ў Магілёўскім настаўніцкім інстытуце. Педагагічны савет інстытута 27 верасня 1913 г. у адпаведнасці з палажэннем аб настаўніцкіх інстытутах і праграмах Маскоўскага і Віцебскага настаўніцкіх і Віленскага хрысціянскага інстытутаў зацвердзіў «прынцыпы і правілы» выкладання прадметаў. Распрацоўваючы праграмы і падбіраючы падручнікі, выкладчык гісторыі і геаграфіі абапіраўся і кіраваўся практыкай і трохгадовым вопытам Віцебскага настаўніцкага інстытута. Так, геаграфію прадугледжвалася выкладаць на першым годзе навучання па праграмах, выпрацаваных у Віцебскім настаўніцкім інстытуце. Планавалася вывучаць фізічную геаграфію па падручніку «Курс фізічнай геаграфіі» Лесгафта, які быў дапушчаны Вучоным камітэтам Міністэрства народнай асветы для VIII класаў жаночых гімназій і настаўніцкіх інстытутаў [8, арк. 2, 12–15].

Па гісторыі планавалася ў 1-м класе прайсці курс старажытнай гісторыі і, па магчымасці, сярэдніх вякоў. У другім і трэцім класах прадугледжвалася завяршыць вывучэнне гісторыі сярэдніх вякоў, прайсці ўсю новую гісторыю, рускую гісторыю і методыку гісторыі. У першым класе прапаноўвалася вывучаць гісторыю па вучэбных кнігах «Древняя история» і «Средняя история» праф. Н. Карэева і па вучэбнай кнізе «Древняя и средняя история» праф. Віпера. [8, арк. 14]

Рудневу адразу прыйшлося асвойваць новыя геаграфічныя вучэбныя прадметы. Займацца гэтым яму давялося і надалей. Так, у наступным 1914/15 нав. годзе ён распрацоўваў камерцыйную геаграфію і методыку геаграфіі. Усё гэта патрабавала моцнага інтэлектуальнага і фізічнага напружвання. Нягледзячы на раней дадзенае абяцанне, яму давялося адмовіць дырэктару інстытута Тычыніну ў просьбе выкладаць царкоўную гісторыю на час адсутнасці ў інстытуце законанастаўніка з-за занятасці новымі прадметамі і адсутнасці «пэўнага вучэбнага дапаможніка» па прадмету [4. арк. л. 13]. Пазней Міхаілу Рыгоравічу давялося выкладаць яшчэ і палітэканомію.

Матэрыяльнае становішча Міхаіла Рыгоравіча пасля пераводу значна палепшылася. У Пінскай жаночай гімназіі ягоны «пастаянны аклад утрымання» складаў 814 руб. 80 кап. у год, а такі самы аклад утрымання на пасадзе выкладчыка інстытута за вылічэннем на пенсію – 1382 руб. 40 кап. З-за розніцы ў акладах у 567 руб. 90 кап. напрыканцы 1914 года ўзнікла неабходнасць кампенсаваць ў даход казне 134 руб. 70 кап. за 4 месяцы працы ў інстытуце пасля пераводу з Пінску. Неабходнасць выплаты грошай у казну выклікала чарговую перапіску і непрыемную сітуацыю ў жыцці Руднева. [4. арк. л. 14–14Аб., 17–21].

Інстытут дзякуючы самаадданай працы супрацоўнікаў не прыпыніў сваёй дзейнасці ні ў гады Першай сусветнай вайны, ні ў рэвалюцыйных умовах 1917 г., ні падчас Грамадзянскай вайны. У гады Першай сусветнай вайны інстытут меў цяжкасці з наборам студэнтаў і памяшканнем. Частка студэнтаў і выкладчыкаў была мабілізавана на фронт. Пасля пераводу Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёў летам 1915 г. большая частка будынка інстытута была занята рознымі вайсковымі і дыпламатычнымі ўстановамі і часцямі.

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі пачалася дэмакратызацыя настаўніцкіх інстытутаў, якія абвяшчаліся аўтаномнымі навучальнымі ўстановамі з падпарадкаван-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нем непасрэдна Міністэрству асветы Расіі. У іх уводзілася выбарнасць педагагічнага кіраўніцтва, дазвалялася выкладанне на родных мовах студэнтаў і вывучэнне нацыянальных моў, літаратуры, гісторыі, краязнаўства.

Выкладчыкі і студэнты ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях, у т.л. у дзейнасці Магілёўскага Беларускага Камітэта. Ад імя педагагічнай рады інстытута, у якую ўваходзіў і Руднеў, выкладчык матэматыкі Яўген Сямёнавіч Аляхновіч быў у снежні дэлегаваны на гістарычны Усебеларускі з'езд 1917 г., які даў магутны штуршок да паскарэння нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва беларусаў. Інстытут працягваў працаваць, нягледзячы на тое, што ў сакавіку 1918 г. горад быў заняты польскімі ўзброенымі фарміраваннямі, якіх у маі змянілі германскія войскі. На сходзе грамадскіх, палітычных арганізацый, дэпутатаў мясцовага земства і гарадской думы 31 сакавіка 1918 г. нацыянальна арыентаваная частка супрацоўнікаў інстытута падтрымала ідэю незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Здароўе Міхала Рыгоравіча ў Магілёве не палепшылася. Не спрыяў гэтаму ні клімат, ні віхуры грамадска-палітычных падзей. У верасні 1918 г. у жыцці Магілёўскага настаўніцкага інстытута адбылася трагічная падзея: заўчасна памёр выкладчык гісторыі, геаграфіі і палітэканоміі Руднеў. На яго месца ў штат інстытута быў прыняты Яўген Іосіфавіч Бычкоў, які ўжо ў канцы года стане наступным кіраўніком інстытута.

Пошукі ў архівах Літвы раскрылі важныя штрыхі і эпізоды біяграфіі першага географа і гісторыка МДУ. Выявілася, што ён ў 1909 г. скончыў курс гістарычнага аддзялення гісторыка-філасофскага факультэта Юр'еўскага ўніверсітэта, меў пасведчанне звання настаўніка гімназіі і прагімназіі з правам выкладання гісторыі, якую потым і выкладаў у Пінскай жаночай гімназіі, быў высокакваліфікаваным спецыялістам і жанатым чалавекам, меў кепскае здароўе.... Ягоны нялёгкі вопыт выкладання геаграфічных дысцыплін у Магілёўскім настаўніцкім інстытуце яшчэ раз нагадвае, што вучэбныя прадметы лепш выкладаць профільным спецыялістам. З яго справы сталі вядомы новыя геаграфічныя дысцыпліны, якія выкладаліся ў інстытуце: камерцыйная геаграфія і методыка геаграфіі. Нягледзячы на атрыманыя звесткі і сёння застаюцца невядомымі вялікія лакуны ў ягонай біяграфіі. Так, мы не ведаем пачатак жыцця М. Р. Руднева, што вымагае далейшых даследаванняў.

**Літаратура:** 1. Агееў, А.Р. Пачатак станаўлення гістарычнай адукацыі ў Магілёўскім педінстытуце (1913 – 1933 гг.) / А.Р. Агееў // Гістарычны факультэт. Да 75-годдзя ўтварэння. – Магілёў: УА «МДУ імя Куляшова», 2010. – С. 15 – 24. 2. Агееў, А. Р. Першыя крокі станаўлення геаграфічнай адукацыі ў Магілёўскім педінстытуце / А. Р. Агееў // А. А. Смоліч і яго час: Матэрыялы навуковых прац першага смолічаўскага семінара Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Тэарэтычныя і прыкладныя праблемы геаэкалогіі» (Мінск – Магілёў, 27 – 29 верасня 2001 г.) / Уклад. У. Хамякоў, І. Шаруха, Г. Рыдзеўскі. – Мн. – Магілёў, 2001. – С. 76–82. 3. Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1913 – 1940 гг.): дакументы і матэрыялы / аўт.-склад.: А.Р. Агееў, К. М. Бандарэнка, В.П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К. М. Бандарэнкі. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2008. – 216 с. 4. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – ф. 567, воп. 19, спр. 410. М. Руднев. 5. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова: мінулае і сучаснасць / А.Р. Агееў, В.А. Бандарэнка, С. А. Парашкоў, П. Г. Рабзонаў і інш.; пад. рэд. В. І. Вішнеўскага – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 260 с. 6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2258. – Воп. 1. – Спр. 6. 7. НГАБ. – Фонд 2258. – Воп. 1. – Спр. 12. 8. НГАБ. – Фонд 2258. – Воп. 1. – Спр. 22.

***Артыкул паступіў у рэдакцыю 21 студзеня 2015 г.***
***Рэцэнзент – С.С. Украінка, член рэдкалегіі часопіса «Магілёўскі мерыдыян» (Магілёў, Беларусь)***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова